БИБЛИОТЕКА БГУ

www.gazeta.bsu.by

БДУ

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 27 снежня 2006 года, № 21 (1951)

## З НОВЫМ ГОДАМ!

***Паважаныя калегі і выхаванцы нашага універсітэта — студэнты, аспіранты і магістранты!***

*Шчыра віншую вас з надыходзячым 2007 годам!*

*Спадзяюся, што для Беларускага дзяржаўнага універсітэта гэта будзе час новых здзяйсненняў на карысць alma-mater і ўсяго калектыву супрацоўнікаў, выкладчыкаў, навукоўцаў, а таксама моладзі, якая вучыцца, працуе і ўжо мае першыя творчыя поспехі ў БДУ!*

*Упэўнены, што нашыя планы па рэфармаванні, далейшым развіцці і ўдасканальванні вучэбна-выхаваўчага працэсу будуць ажыццяўляцца паспяхова, каб Беларускі дзяржаўны універсітэт заставаўся вядучай навучальнай установай, гонарам і адным з галоўных сімвалаў нашай краіны!*

*Плёну і натхнення вам у творчасці, моцнага здароўя, шчасця і радасці, любові і кахання!*

*З Новым годам!*

**Рэктар, прафесар Васіль СТРАЖАЎ**

### ПАДЗЕІ

## ПАДАРУНКІ З ТУРЦЫІ

***Цэнтр турэцкай мовы і культуры адкрыўся 13 снежня на філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта. У цырымоніі адкрыцця прынялі ўдзел рэктар БДУ Васіль Стражаў і рэктар Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта Наталля Баранава, дэкан філалагічнага факультэта БДУ Іван Роўда, прадстаўнікі грамадска-культурнага аб'яднання "Дастлук" (у перакладзе з турэцкай — сяброўства), выкладчыкі і студэнты БДУ.***



Новы цэнтр абсталявалі сучаснымі камп'ютарамі, мультымедыйнымі і тэхнічнымі сродкамі. У ім сабрана метадычная краіназнаўчая і мастацкая літаратура на турэцкай мове. Тут будуць праходзіць заняткі па гэтай замежнай мове для беларускіх студэнтаў і рускай мове — для студэнтаў з Турцыі.

Напярэдадні былі ўзнагароджаны пераможцы і прызёры конкурсу сачыненняў сярод студэнтаў БДУ "Беларусь — Турцыя: мінуўшчына, сучаснасць, будучыня". У ім прынялі ўдзел каля 70 чалавек. Першае месца дасталася студэнту чацвёртага курса гістарычнага факультэта Андрэю Рудзю, які атрымаў лічбавы фотаапарат. Другім стаў студэнт другога курса філалагічнага факультэта Антон Уласенка: яго ўзнагародзілі мабільным тэлефонам. На трэцім месцы апынулася першакурсніца факультэта журналістыкі і карэспандэнт нашай газеты Лейла Ісмаілава: ёй дастаўся MP4-прайгравальнік. Заахвочвальным прызам журы таксама адзначыла студэнтку чацвёртага курса фізічнага факультэта Юлію Баброву — за арыгінальнасць раскрыцця тэмы.

Дарэчы, сёлета навучэнцамі БДУ сталі шэсць грамадзянаў Турцыі: два з іх вучацца ў магістратуры факультэта міжнародных адносін, а чацвёра сталі студэнтамі філалагічнага факультэта. Акрамя таго, на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі навучаюцца 22 турэцкія слухачы.

**Марыя АКУЛІК**
**Фота Віктара ТАЛОЧКІ, БЕЛТА**

### ВЕДАЙ НАШЫХ!

## НАЙЛЕПШЫЯ ПА ЎСІХ НАПРАМКАХ



***Беларускі дзяржаўны універсітэт стаў безумоўным лідэрам сярод ВНУ Маскоўскага раёна сталіцы паводле вынікаў гэтага года, падведзеных раённай адміністрацыяй.***

Найперш БДУ быў прызнаны пераможцам у спаборніцтве за найлепшую арганізацыю ідэалагічнай работы.

Такую высокую адзнаку наш універсітэт атрымаў за выкананне найважнейшых сацыяльна-эканамічных паказчыкаў. Пры гэтым улічваліся своечасовая выплата заробкаў, наяўнасць і стан навучальных і лабараторных памяшканняў, колькасць сродкаў, выдаткаваных на паляпшэнне сацыяльна-бытавых умоў супрацоўнікаў, эфектыўнасць метадаў і формаў ідэалагічнай работы, удзел ў грамадска-палітычных, культурных і спартыўных мерапрыемствах усіх ўзроўняў, узаемадзеянне са студэнцкімі аб'яднаннямі, дзейнасць сродкаў масавай інфармацыі БДУ і інш.

* * *

А 12 снежня ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры былі ўзнагароджаны лаўрэаты штогадовага раённага агляду-конкурсу "Лідэр года — 2006". Пераможцам стаў намеснік начальніка ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю БДУ Аляксей Багамазаў, які атрымаў ганаровы тытул "Чалавек на сваім месцы". Студэнцкі цэнтр занятасці нашага універсітэта, у сваю чаргу, заняў першае месца ў намінацыі "Арганізацыя працаўладкавання моладзі".

Конкурс ладзіў аддзел па справах моладзі адміністрацыі Маскоўскага раёна. У ім прымалі ўдзел маладзёжныя арганізацыі і аб'яднанні, прадстаўнікі працоўных і творчых калектываў прадпрыемстваў і устаноў, а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі да 31 года, праца якіх накіравана на рэалізацыю дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

* * *

Таксама студэнты Белдзяржуніверсітэта перамаглі ў спартакіядзе сярод ВНУ Маскоўскага раёна сталіцы. Удзел у ёй прымалі каманды БДУ, БДПУ, БДМУ і Інстытута правазнаўства. Прызёры вызначаліся па наступных відах спорту: шашкі, шахматы, бег, валейбол, футбол, плаванне, настольны тэніс, лыжы, стральба, баскетбол і мнагаборства. Акрамя таго, другое месца ў раённай спартакіядзе занялі супрацоўнікі БДУ, якія паспяхова выступалі на спартыўных мерапрыемствах на працягу года.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю**
**Фота Аляксандра СНАПКА**

## ЛІЦЭЙ — ПЕРШЫ Ў МАТЭМАТЫЦЫ!

Каманда ліцэя БДУ заняла першае месца на рэспубліканскім турніры юных матэматыкаў, які адбыўся 9—12 снежня. Званне пераможцы ліцэісты падзялілі з камандай мінскай школы № 41.

Спаборніцтва ладзіў факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Белдзяржуніверсітэта пры падтрымцы Міністэрства адукацыі. За выхад у фінал змагаліся 14 школьных камандаў з усёй Беларусі, а таксама з Расіі і Казахстана. Дарэчы, поспех школы № 41 (летась яе вучні сталі пераможцамі турніру) абумоўлены тым, што ўжо не першы год у ёй вядуць заняткі выкладчыкі ФПМІ.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**УНІВЕРСІТЭТАЗНАЎСТВА ЯК СВЕТАПОГЛЯД**
Пра новы вучэбны курс у Белдзяржуніверсітэце
Стар. 2

**«УЗРОСТ ЧАЛАВЕКА ВЫЗНАЧАЕЦЦА ЯГО МАГЧЫМАСЦЯМІ»**
Інтэрв'ю з прафесарам Альбертам ЕЛСУКОВЫМ, якому споўнілася 70 гадоў
Стар. 3

**ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ СТУДГАРАДКА**
Літаратурна-музычная гасцёўня на старонках "Універсітэта"
Стар. 4

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ПЫТАННІ далейшага развіцця вышэйшай школы абмеркаваны на пасяджэнні Рэспубліканскага савета рэктараў ВНУ Беларусі, якое адбылося 19 снежня з удзелам кіраўніка краіны Аляксандра Лукашэнкі.

РЭКТАР БДУ прафесар Васіль Стражаў 15 снежня прыняў удзел у выязным пасяджэнні калегіі Камітэту дзяржкантролю, на якім абмяркоўваліся праблемы, звязаныя з выкананнем Дзяржпраграмы "Экалагічнае аздараўленне возера Нарач 2005—2008 гг."

ПРА ПАДРЫХТОЎКУ юрыдычных кадраў у БДУ расказаў рэктар Белдзяржуніверсітэта прафесар Васіль Стражаў 11 снежня на пасяджэнні праваога кансультацыйнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

ДЭКАН хімічнага факультэта Уладзімір Панькоў загадам рэктара прызначаны прарэктарам БДУ па навуковай рабоце ў сувязі з пераходам на працу ў НАН Беларусі Сяргея Рахманава.

КІРАЎНІКІ БДУ і Харкаўскага нацыянальнага універсітэта падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве двух ВНУ.

НА БАЗЕ САК "Брыганціна" 15 снежня прайшоў выязны навучальны семінар для куратараў вучэбных груп нашага універсітэта. На ім выступіў прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях БДУ У.В. Сувораў на тэму "Інстытут куратарства ў сістэме выхаваўчай работы БДУ".

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

АКТУАЛЬНА

# УНІВЕРСІТЭТАЗНАЎСТВА ЯК СВЕТАПОГЛЯД

***У 2007/2008 навучальным годзе ў БДУ ўводзіцца новы вучэбны курс — "Універсітэтазнаўства". Пра гэта расказаў дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта, дарадца рэктара Уладзімір Аляксандравіч НАВУМОВІЧ.***

**— У чым сутнасць новаўвядзення?**

— "Універсітэтазнаўства" сінтэзуе шматлікія веды з гісторыі, філасофіі, культуралогіі, геаграфіі, філалогіі, дыпламатыі. Яно ўключае ў сябе і гісторыю універсітэтаў, іх ролю ў грамадстве. Такім чынам, гэта сістэмны прадмет. У далёкай старажытнасці матэматыка, фізіка, філасофія, прыгожае пісьменства і інш. аб'ядноўваліся ў адну навуку — навуку жыцця. Такой нам бачыцца і новая праграма. Яна, у рэшце рэшт, вядзе да гуманітарызацыі адукацыі ва ўсім універсітэце.

У яе межах прадугледжаны экскурсіі па універсітэцкім дворыку на тэму "Асветнікі зямлі беларускай", наведванні новага Музея гісторыі нашага універсітэта, іншых музеяў, аранжарэі і батанічнага сада, а таксама навукова-даследчых цэнтраў. Плануюцца семінары-дыялогі першакурснікаў з рэктарам, сустрэчы з дэканамі факультэтаў, знаёмства з фондамі універсітэцкай бібліятэкі, прагляды кінафільмаў пра БДУ.

Структура ВНУ, студэнцкія арганізацыі, спецыфіка вучобы, адметнасці студэнцкага асяроддзя, суадносіны навуковага і творчага светапоглядаў — усё стаіць у цэнтры нашай увагі. Гэта інтэгральны курс, які аб'ядноўвае веды макра- (космас) і мікрасвету (чалавек).

**— Каму належыць ідэя стварэння такой дысцыпліны?**

— Гэта той шчаслівы выпадак, калі задума належыць кіраўніцтву, але захапіла ўсіх. Яе дэвізам сталі словы "Пазнай свой універсітэт".

Першым з такой прапановай выступіў рэктар Васіль Стражаў, які яшчэ ўлетку 2006 г. узняў пытанне, як лепей наладзіць патрыятычную работу сярод студэнтаў. Дакладней — як навучыць юнакоў і дзяўчат ганарыцца сваёй альма-матэр. Для гэтага неабходна запаліць у кожным сэрцы радасць і захапленне ад далучэння да універсітэцкай сям'і. Прыгадайце, як кожны з нас быў узрушаны, калі паступіў вучыцца ў БДУ або стаў супрацоўнікам вядучай ВНУ Беларусі.

**— Што гэты курс дасць студэнтам?**

— Ён паспрыяе развіццю талентаў, фарміраванню гарманічнага чалавека свайго часу, абуджэнню творчай думкі. Важна дапамагчы кожнай асобе найбольш поўна і глыбока раскрыцца, даць магчымасць "знайсці сябе". Яшчэ адна мэта — далучыць да слаўных традыцый, нагадаць пра слынныя навуковыя постаці, расказаць пра ўнёсак вучоных БДУ ў айчынную навуку. Трэба, каб студэнты — будучыя маладыя спецыялісты захавалі ў сабе адмысловы карпаратыўны дух Белдзяржуніверсітэта.

Апошнім часам з'явілася нямала студэнтаў "з глыбінкі", шмат вяскоўцаў. Іх, а таксама ўсіх астатніх, трэба пазнаёміць не толькі з размяшчэннем навучальных карпусоў і будынкаў культурна-бытавога прызначэння, але і з некаторымі фундаментальнымі ідэямі, што складаюць аснову універсітэцкай супольнасці.

Найперш студэнтаў цікавяць "пажыўныя" месцы — дзе пад'есці, адпачыць, павесяліцца. Гэта зразумела, але трэба, каб не толькі "макдональдсы" і дыскатэкі вабілі моладзь у вольны час, а яшчэ бібліятэкі, музеі, дзе захоўваецца назбіраны за стагоддзі духоўны вопыт усяго чалавецтва.

Варта адзначыць, што курс павінен падрыхтоўваць студэнтаў не толькі да засваення сумы ведаў, але і да жыцця. "Мы вучымся не для школы, а для жыцця", — такі надпіс на латыні змешчаны пры ўваходзе ў рэктарат БДУ. Неабходна навучыць студэнтаў вучыцца, даць ім трывалы арыенцір на будучым жыццёвым шляху.

Л.М. Талстой пісаў, што, калі душы людскія пустыя, іх не запоўніць ні закон, ні палітыка. Хочацца, каб нашы студэнты ведалі, навошта яны прыйшлі ў гэты свет, чаго жадаюць, дзе бачаць сваё месца ў ім. У гэтым сэнсе "Універсітэтазнаўства" — дысцыпліна не толькі метадалагічная, але і светапоглядная.

**— Якім чынам гэты курс будзе арганізаваны?**

— Яго будуць чытаць выкладчыкі гістарычнага, філалагічнага і іншых факультэтаў ва ўсіх вучэбных падраздзяленнях універсітэта. Першапачаткова ён будзе выкладацца на першым курсе. Праводзіць яго будзем па-беларуску, каб студэнты (асабліва прыродазнаўчых дысцыплін) не забывалі родную мову.

**Гутарыла**
**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

НАША СПАДЧЫНА

# АДСЮЛЬ ПАЧЫНАЎСЯ УНІВЕРСІТЭТ

Белдзяржуніверсітэт павёў адлік сваёй гісторыі з 30 кастрычніка 1921 г. Яго стварэнне стала знамянальнай падзеяй у жыцці беларускага народа. Над нашай краінай зноў распасцерліся крылы адукацыі і навукі вышэйшага кшталту. Гісторыя БДУ па сутнасці — гэта гісторыя беларускай дзяржаўнасці.

Станаўленне універсітэта было выключна цяжкім. У дзяржавы не хапала сродкаў на забеспячэнне яго самым простым, але неабходным абсталяваннем, прыладамі і г.д. Першаснай задачай было — знайсці ў разбураным рэвалюцыйнымі падзеямі, а потым і польскай акупацыяй Мінску больш-менш прымальныя для навучальных заняткаў будынкі і памяшканні. Іх трэба было адшукаць, прыстасаваць да універсітэцкіх патрэб. З юрыдычнага пункту гледжання, перашкод для савецкай улады не было: усе яе дзеянні абгрунтоўваліся задачамі будаўніцтва новага грамадства і выхоўвання для яго людзей новага гарту. Таму адпаведныя будынкі проста перадаваліся універсітэту. У 1921 г. спецыяльнай пастановай Прэзідыума ЦВК Беларусі ад 18 красавіка быў афіцыйна зацверджаны спіс аб'ектаў, якія адыходзілі БДУ. Тут былі гімназія, фабрыка, рэальнае і духоўнае вучылішчы, духоўная семінарыя, ваенны шпіталь і г.д.

Асобнае месца ў гэтым дастаткова доўгім пераліку займаюць гімназія Фальковіча і вучылішча Хайкіна. У гісторыю універсітэта будынак былой гімназіі ўвайшоў як "Першы дом БДУ", ці "Дом № 1 БДУ", бо ў ім працаваў рэктар, дзейнічалі бібліятэка і канцылярыя, вяліся заняткі на рабочым факультэце. Тут адбылося ўрачыстае адкрыццё першага нацыянальнага універсітэта. Гэты будынак знаходзіўся на рагу



*Былы выгляд гімназіі Фальковіча*

вуліц Магазіннай і Кашарнай яшчэ з 1863 г.: яго пабудаваў для сваёй сям'і купец Сакер. З гадамі мяняліся ўладальнікі гэтага неардынарнага па сваёй архітэктуры невысокага дома. Мяняліся і назвы вуліц, на якіх ён стаяў: Кашарная стала называцца Батальённай, потым — Скобелеўскай, пры савецкай уладзе — Чырвонаармейскай. Магазінная вуліца (і гэта знамянальна) з 1922 г. атрымала назву Універсітэцкай, бо на ёй стаялі галоўныя будынкі БДУ: "Дом № 1" — былая гімназія Фальковіча, "Дом № 2" — былая фабрыка "Вікторыя" і "Дом № 3" — былое вучылішча Хайкіна. А тая вуліца, дзе размясціліся інтэрнаты (іх было няшмат, і ўмовы там былі зусім "спартанскія"), стала Студэнцкай. Яна існуе і сёння, але ўжо не мае ніякага дачынення да навучэнскай моладзі.

Будынак рэальнага вучылішча, які да рэвалюцыі належаў (як і сама прыватная ўстанова) Э.М. Хайкіну, адметны тым, што ў яго аўдыторыях распачаліся заняткі: якраз тут 31 кастрычніка 1921 г. прафесар-гісторык Дзмітрый Канчалоўскі прачытаў першую лекцыю студэнтам факультэта грамадскіх навук на тэму "Культура Міжземнамор'я ў эпоху панавання Рыма". Да заняткаў аўдыторыю давялося рыхтаваць самому выкладчыку, якому дапамагаў прафесар-філосаф Сямён Вальфсон, бо штат служачых быў яшчэ не набраны. На дзвярах гэтага памяшкання чырвона-сінім алоўкам рэктар Уладзімір Пічэта напісаў: "Аўдыторыя № 1".

У першую зіму не хапала дроваў, каб добра напаліць печы. Студэнты і выкладчыкі сядзелі ў аўдыторыях у верхняй вопратцы: футрах, шынялях, фуфайках. Часта займаліся пры свечках. Вагоны з дровамі студэнты самі разгружалі, падвозілі да факультэта, пілавалі, калолі. А бывала, што і самі збіралі брыгады ў лес, каб нарыхтаваць паліва.

Так нараджаўся універсітэт. Зараз у былым "Доме № 1" размяшчаецца гістарычны факультэт. Адбудаваны ў 50-я гады, ён захаваў некаторыя ранейшыя абрысы і архітэктурныя параметры.

**Ірына ШЫК**

## ВІВАТ, БДУ!

***Да свайго юбілею БДУ атрымаў цудоўны падарунак — песню-прысвячэнне. Словы да яе напісаў паэт Леанід Дранько-Майсюк, а музыку — кампазітар Ігар Лучанок. Прэм'ера адбылася на ўрачыстым пасяджэнні ў гонар 85-годдзя нашага універсітэта. Мы знаёмім вас з тэкстам гэтай песні.***

Шчасце навукі – жаданае шчасце
У самастойным жыцці;
Трэба і розум, і сілу прыкласці,
Папараць-кветку знайсці.

**Прыпеў:**
Беларускі дзяржаўны універсітэт –
Дом навукі айчыннай і творчасці свет.
Веды слаўных вякоў у твой лёс увайшлі
І дабро нашай любай зямлі.

Светлы, прасторны, гасцінны і родны!
З будучыняй залатой!
Папараць-кветка галінкай лагоднай
Герб упрыгожыла твой.

**Прыпеў.**

Словы падзякі, нібы дыяменты!
З іх мы ствараем хвалу:
Слава выкладчыкам, слава студэнтам,
Слава табе, БДУ!

**Прыпеў.**

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# ЗАВІТАЛІ Ў ПАРЛАМЕНТ



Студэнты юрыдычнага каледжа і юрыдычнага факультэта БДУ 11 снежня наведалі Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Яны пазнаёміліся з працай ніжняй палаты парламента і дзейнасцю яе пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі (старшыня Юрый Аляксандравіч Кулакоўскі). Студэнты атрымалі магчымасць station паназіраць за працай дэпутацкага корпуса на пленарным пасяджэнні пятай сесіі Палаты прадстаўнікоў трэцяга склікання Нацыянальнага сходу. Падчас далейшай дзвюхгадзіннай сустрэчы з Юрыем Кулакоўскім студэнты абмеркавалі надзённыя пытанні ў галіне адукацыі, эканомікі, сацыяльнай палітыкі.

**Антон САСНОЎСКІ,**
**метадыст упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЦЕПЛЫНЯ ДУШЫ Ў ПАДАРУНАК

У бурлівым сённяшнім жыцці студэнты гуманітарнага факультэта звяртаюць увагу на людзей, якім патрэбна душэўная цеплыня і звычайнае разуменне, і прапануюць канкрэтную дапамогу ў многіх складаных і балючых сітуацыях.

На гэта скіраваны праект гуманітарнага факультэта "Падзяліся цеплынёй сваёй душы". Яго галоўнымі арганізатарамі з'яўляюцца намеснік дэкана Іван Янушэвіч, а таксама студэнткі II курса Крысціна Салоўская і Элеанора Крыніцкая.

Першая акцыя прайшла 16 лістапада ў Рэспубліканскім дзіцячым анкалагічным цэнтры ў Бараўлянах. Нашы студэнты зладзілі для тамтэйшых выхаванцаў шоу "Фабрыка зорак—7", дзе выступілі ў вобразах знакамітых эстрадных спевакоў. Малыя дзяўчаты і хлапчукі таксама змаглі паспяваць свае ўлюбёныя песні пад караоке, а яшчэ — атрымаць у падарунак фарбы, фламастэры, альбомы для малявання. 28 лістапада на просьбу дзяцей і адміністрацыі цэнтра канцэрт быў праведзены яшчэ раз.

Гэта мерапрыемства стала пачаткам доўгатэрміновага праекта, які ўключае таксама шэфства над адным з дзіцячых дамоў і домам састарэлых у Мінску. Яго галоўная мэта — арганізаваць валанцёрскі рух, скіраваны на развіццё ў студэнтах пачуцця адказнасці і спачування, аказанне сапраўднай падтрымкі тым, хто мае ў гэтым патрэбу. Важныя першыя крокі на дабрачынным шляху студэнты гуманітарнага факультэта ўжо зрабілі і са шчырым сэрцам рыхтуюцца да наступных.

Вось такая цудоўная ініцыятыва стала адным з пераможцаў у сёлетнім студэнцкім конкурсе "Лепшы маладзёжны праект".

**Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**

АСОБЫ

# «УЗРОСТ ЧАЛАВЕКА ВЫЗНАЧАЕЦЦА ЯГО МАГЧЫМАСЦЯМІ»

**9 снежня вядомаму беларускаму сацыёлагу, доктару філасофскіх навук, прафесару Альберту Елсукову споўнілася 70 гадоў. Але, як адзначана ў кнізе "Філасофія жыцця ў афарызмах і вершах", якую напісаў сам Альберт Мікалаевіч, узрост чалавека вызначаецца не тым, колькі яму гадоў, а тым, што ён можа. А здольны прафесар Елсукоў у свае 70 на многае. На сённяшні дзень ён з'яўляецца намеснікам загадчыка кафедры сацыялогіі ФФСН, намеснікам старшыні савета па абароне доктарскіх дысертацый па сацыялогіі, членам Вышэйшага кансультацыйнага савета Беларускага грамадскага аб'яднання "Сацыялагічнае таварыства", а таксама шэрага іншых саветаў і грамадскіх арганізацый. Ён актыўна займаецца навуковай, педагагічнай і творчай дзейнасцю. У дні святкавання 85-годдзя БДУ яму ўручылі нагрудны знак Міністэрства адукацыі Беларусі "Выдатнік вышэйшай школы".**



**— Якім чынам Вы звязалі сваю прафесійную дзейнасць з філасофіяй?**

— Яшчэ ў юнацтве я зацікавіўся філасофіяй. Аднак аддзялення філасофіі на той час у нашай краіне не існавала. Таму я паступіў на гістарычны факультэт, дзе атрымаў глыбокую гуманітарную адукацыю з добрай метадалагічнай базай. Пасля заканчэння універсітэта працаваў настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства, у школе назапашваў педагагічны досвед. Але ў глыбіні душы я заўжды захоўваў цікавасць да філасофіі і ніколі не страчваў сувязі з гэтай навукай. Урэшце я перайшоў працаваць на кафедру філасофіі Беларускага політэхнічнага інстытута, а ў 1966-м паступіў у аспірантуру філасофскага факультэта МДУ імя М.В. Ламаносава.

**— З 1973 г. Ваша прафесійная дзейнасць звязана з Белдзяржуніверсітэтам. Раскажыце, калі ласка, пра гэты перыяд свайго жыцця.**

— Пасля абароны кандыдацкай дысертацыі я вярнуўся ў БПІ. Але неўзабаве ў БДУ адкрылася кафедра філасофіі гуманітарных факультэтаў, і я адразу ж адгукнуўся на запрашэнне загадчыка кафедры Георгія Давідзюка і працаваў тут да 1987 г.

На гістарычным факультэце ў той час існавалі эканамічнае і філасофскае аддзяленні, якія пачыналі развівацца ў самастойныя структуры. Інтэнсіўна вяліся распрацоўкі і ў галіне сацыялогіі. Было вырашана стварыць новы факультэт на базе гэтых трох аддзяленняў. Я тады ўжо быў прафесарам, загадчыкам кафедры філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў і адзіным на той момант доктарам філасофскіх навук, прычым актыўна займаўся сацыялогіяй. У 1989 г. адкрыўся філасофска-эканамічны факультэт, і я быў прызначаны яго дэканам. Адразу ж узначаліў і кафедру сацыялогіі, якой кіраваў да 2003 г. Пад маім асабістым кіраўніцтвам за ўвесь час былі абаронены 20 кандыдацкіх і 5 доктарскіх дысертацый.

**— Вы дагэтуль шмат працуеце. Адкуль бярэце сілы і энергію?**

— Гэта, відаць, прыроднае. Колькі я сябе памятаю, заўжды быў у руху. У юнацкія гады я любіў усе гульнявыя віды спорту. Асабліва футбол. Актыўна займаўся творчай самадзейнасцю. Цяпер на працы даводзіцца шмат хадзіць і нават бегаць на занятки па лесвічных маршах. Акрамя таго, я заўжды раблю гімнастыку. І не толькі дзеля захавання здароўя, а проста самому гэта вельмі падабаецца. Мне 70 гадоў, а я езджу на ровары, узімку хаджу на лыжах, улетку плаваю з сябрамі на байдарках. Калі ў чалавека ёсць гэткі імпульс, то ён захаваецца да самай старасці.

**— Вы займаецеся шырокай навуковай і творчай дзейнасцю. Распавядзіце пра Вашы інтарэсы...**

— Працуючы ва універсітэце, мне даводзілася часта бываць за мяжой: чытаў лекцыі ў Балгарыі, Ізраілі, Германіі, Францыі. Мною падрыхтавана больш за 100 навуковых публікацый, вялікая колькасць падручнікаў і некалькі энцыклапедычных выданняў. Зусім нядаўна выйшла манаграфія "Сацыялогія ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Гісторыя, факты, дакументы", напісаная мной у сааўтарстве з А.М. Данілавым і Д.Г. Ротманам. У сваіх даследаваннях я ўвесь час схіляюся да гісторыі і метадалогіі навукі. Мяне цікавіць гісторыя філасофіі, рэлігіі, мастацтва. Па ўсіх гэтых пытаннях ужо шмат напісана, але застаецца багата і недаследаваных тэм. Займаюся я таксама і літаратурнай творчасцю. Яна для мяне асабліва істотная. Мая кніга "Філасофія жыцця ў афарызмах і вершах", якая выйшла ў 2000 г., атрымала станоўчую ацэнку ў спецыялістаў.

**— Ці ёсць у Вас цікавыя планы і ідэі, якія хацелася б увасобіць у жыццё?**

— Калі я над нечым працую, у мяне паралельна ўзнікае мноства ідэй. Я іх запісваю ў выглядзе назваў сваіх будучых кніг. Такіх назваў у мяне ўжо назбіралася 50, але яны наўрад ці будуць рэалізаваныя, бо часу на гэта заўсёды не хапае. Даводзіцца сыходзіць з асабістых інтарэсаў і магчымасцяў. Напэўна, і надалей я буду працаваць над напісаннем навучальнай літаратуры. Аднак можна падумаць і пра мемуары...

**Гутарыла Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

## ДЗЕНЬ ЖУРФАКА Ў ГОМЕЛІ

У канцы лістапада ў Гомелі адбыўся выязны семінар "Абітурыент-студэнт-журналіст: праблемы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі прафесійных кадраў для рэгіянальных СМІ", у якім прынялі ўдзел 12 выкладчыкаў і супрацоўнікаў журфака, прадстаўнікі ўпраўлення ідэалагічнай работы Гомельскага аблвыканкама, супрацоўнікі рэдакцый "Гомельская праўды" і раённых газет вобласці.

На сустрэчы гаварылі пра забеспячэнне журналісцкімі кадрамі рэдакцый рэгіянальных выданняў, а таксама пра павышэнне эфектыўнасці вытворчай практыкі студэнтаў. Дэкан факультэта журналістыкі, дацэнт С.В. Дубовік расказаў прысутным пра ўнёсак выкладчыцкага калектыву факультэта ў рэалізацыю Комплекснай праграмы развіцця журналісцкай адукацыі ў Беларусі, спыніўся на вострых пытаннях, звязаных з размеркаваннем маладых спецыялістаў, не да канца рэалізаваных рэзервах мэтавай формы навучання.

У рамках гэтага мерапрыемства адбыўся Дзень адкрытых дзвярэй, на якім пабывалі больш за 120 выпускнікоў школ вобласці. Выкладчыкі факультэта пазнаёмілі будучых абітурыентаў з правіламі прыёму на 2007 год, адказалі на шэраг пытанняў пра асаблівасці правядзення творчага конкурсу.

**Пётр ДАРАШЧОНАК, загадчык кафедры гісторыі журналістыкі і літаратуры факультэта журналістыкі БДУ.**

## МЕМАРЫЯЛЬНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

На філалагічным факультэце 7 снежня адбылася Трэцяя міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Фальклор і этнакультура ў індаеўрапейскім кантэксце". Яна прысвячалася 80-годдзю з дня нараджэння выдатнага беларускага навукоўца-фалькларыста Анатоля Сямёнавіча Фядосіка (1926 — 2005) — доктара філалагічных навук, прафесара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, заслужанага дзеяча навукі Беларусі.

У працы канферэнцыі прынялі ўдзел вучоныя, выкладчыкі і аспіранты з універсітэтаў і навукова-даследчых інстытутаў Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы.

На пленарным пасяджэнні было прынята рашэнне даць мемарыяльнай канферэнцыі назву "Фядосікаўскія навуковыя чытанні" і зрабіць яе штогадовай, пачынаючы з 2008 г.

## СЕРТЫФІКАТ ЗА СТАЖЫРОЎКУ

***У Інстытуце бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ 18 снежня адбылася ўрачыстая цырымонія, на якой атрымалі сертыфікаты ўдзельнікі Праграмы павышэння кваліфікацыі кіраўніцкіх кадраў у галіне міжнароднага бізнесу.***

Яна праходзіла ў рамках новага сумеснага беларуска-нямецкага праекта, які пачаўся ў кастрычніку 2006 г. У ім прынялі ўдзел выпускнікі праграмы МВА і іншых падобных праграмаў павышэння кваліфікацыі для маладых упраўленцаў з Беларусі, зацікаўленых у супрацоўніцтве з нямецкімі партнёрамі. З пададзеных 52 заявак былі абраны 16 кандыдатаў для стажыроўкі ў Германіі. Падчас візіту з 13 лістапада па 9 снежня ўдзельнікі праекта наведвалі нямецкія прадпрыемствы і фірмы, пабывалі ў працоўных саюзах, парламенце і гандлёвых аб'яднаннях Германіі, сустракаліся з мясцовымі прадпрымальнікамі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## БДУ ў СМІ Беларусі

Вынікі 8-га адкрытага рэспубліканскага турніру юных матэматыкаў, у якім перамаглі вучні ліцэя БДУ разам са школьнікамі сярэдняй школы №41 г.Мінска, — **"Матэматыка з "мастацкім ухілам" ("Звязда", 15.12); "На бой выклікаюць матэматыкі" ("Настаўніцкая газета", 16.12; "Одно первое место на двоих" ("Рэспубліка", 19.12).**

Пра кафедру грамадскага здароўя і аховы здароўя БДУ — **"Дыплом БДУ — універсальныя веды, або Жыццё бліжняга ў тваіх руках" ("Звязда", 15.12).**

Падрыхтоўка да адкрыцця ў БДУ Рэспубліканскага інстытута імя Канфуцыя — **"Китайский я выучу только за то..." ("Советская Белоруссия", 14.12).**

Адкрыццё цэнтра турэцкай мовы і літаратуры ў БДУ — **"Студенты БГУ заговорят по-турецки" ("Рэспубліка", 13.12); "Центр турецкого языка и культуры открылся на филологическом факультете Белгосуниверситета..." ("Вечерний Минск", 15.12); "Астравок" турэцкай культуры ў БДУ" ("Звязда", 16.12); "Студэнты БДУ пачнуць вывучаць турэцкую мову" ("Настаўніцкая газета", 19.12).**

Выстава "Каменная казка" — **"Святочны падарунак ад майстроў "Каменнай казкі" ("Звязда", 13.12); "В гостях у сказки. Каменной" ("Рэспубліка", 13.12).**

Ушанаванне студэнтаў БДУ — лаўрэатаў Рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх навуковых прац Спецыяльным фондам прэзідэнта краіны па падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў — **"Талантам надо помогать" ("Минский курьер", 08.12), а таксама пра асаблівасці сёлетняга конкурсу — "Конкурс гатовы перайсці ў электронны фармат" (гутарка з сакратаром аргкамітэта, начальнікам адзела навукова-даследчай работы студэнтаў упраўлення падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі Галоўнага ўпраўлення навукі БДУ Аляксандрам Захаравым).**

Перамога БДУ ў конкурсе Маскоўскага раёна на лепшую арганізацыю ідэалагічнай работы — **"Побывали у всех и назвали лучших" ("Минский курьер", 09.12).**

Рэспубліканская акцыя "Стоп-СНІД", якая праходзіла ў БДУ, — **"Выбираем жизнь" ("Знамя юности", 08.12).**

Наведванне БДУ парламенцкай дэлегацыяй з Турцыі — **"Делегаты из Турции побывали в БГУ" ("Рэспубліка", 08.12).**

10-годдзе Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ — **"Перемены в зеркале социологии" ("Рэспубліка", 07.12).**

Супрацоўніцтва кафедры рускай літаратуры БДУ з Пермскім дзяржаўным універсітэтам — **"Литература сближает" ("Настаўніцкая газета", 07.12).**

Семінар "Абітурыент — студэнт — журналіст" у Гомелі — **"Журфак в гостях у гомельчан" ("Вечерний Минск", 04.12); "Кадры решают все..." ("Знамя юности", 08.12); "Поедут ли журналисты в глубинку?" ("Рэспубліка", 07.12).**

Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Журналістыка-2006: тэорыя, практыка, творчасць" — **"Журналістыка-2006: тэорыя, практыка, творчасць" ("Звязда", 05.12).**

Выхад каманды БДУ ў фінал чэмпіянату свету па праграміраванні сярод студэнтаў — **"Белорусские студенты — в финале мирового первенства" ("Вечерний Минск", 04.12); "В Страну восходящего солнца — за победой" ("Минский курьер", 05.12); "Ад міжнароднай алімпіяды па інфарматыцы да чэмпіянату свету па праграмаванні — адзін крок" ("Настаўніцкая газета", 07.12).**

Фінал 3-га конкурсу аратарскага майстэрства "Залатавуст-2006" у юркаледжы БДУ — **"Кто кого переговорит?" ("Минский курьер", 06.12); "Студент-златоуст..." ("Рэспубліка", 07.12).**

Пра пераможцаў 8-га маладзёжнага фестывалю эстраднай творчасці "Белая Русь", сярод якіх студэнтка БДУ Вера Маркава, — **"Богата столица талантами" ("Минский курьер", 06.12).**

*Пра гэтыя і іншыя падзеі ў БДУ шырока паведамлялі ў сваіх матэрыялах інфармацыйныя агенцтвы, тэлеканалы, Беларускае радыё і FM-станцыі.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

АБ'ЯВЫ

### РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: філасофіі і метадалогіі навукі, этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ фізікі цвёрдага цела;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: інтэлектуальных сістэм, фізічнай электронікі, крыміналістыкі, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, сацыяльна-гуманітарных навук, філасофіі культуры;

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ фізічнага выхавання і спорту.

**Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г.Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

### ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады**

выкладчыка кафедры дзяржаўнага права (1).

**Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.**

### "ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ" БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады**

Лабараторыя моцнатокавай электронікі:

*навуковы супрацоўнік (1);*

Лабараторыя электрадынамікі неаднародных асяроддзяў:

*навуковы супрацоўнік (1).*

**Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31.**

### ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ"

**запрашае на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку ў студзені-сакавіку 2007 г.**

выкладчыкаў і спецыялістаў устаноў адукацыі па наступных напрамках:

1. Арганізацыя міжнародных сувязей (для супрацоўнікаў міжнародных аддзелаў ўстаноў адукацыі) — 08.01—19.01;
2. Інтэрактыўныя тэхналогіі работы з моладдзю ў працэсе ўдасканальвання ідэалагічнай і выхаваўчай работы (для куратараў студэнцкіх груп, спецыялістаў па сацыяльнай і выхаваўчай рабоце) — 08.01—12.01 і 19.03—23.03;
3. Замежная мова (англійская мова) як аснова сацыяльнай дзелавой камунікацыі сучаснага спецыяліста (для прафесарска-выкладчыцкага і вучэбна-дапаможнага персаналу ВНУ) — 08.01—16.03, заняткі 2 разы ў тыдзень.

**Перападрыхтоўка з прысваеннем кваліфікацыі:**

1. Інфармацыйна-ідэалагічная і выхаваўчая работа ва ўстановах адукацыі (для кіраўнікоў і спецыялістаў устаноў адукацыі) — 08.01.2007—22.12.2007, 1 этап: 08.01—03.02.

Калі Вас зацікавіла наша інфармацыя і Вы гатовы прыняць удзел у курсах, тэлефануйце па №№ 222-83-03, 200-20-47 для папярэдняга запісу ў групы.

Наш адрас: 220007, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, каб. 319, тэл./факс 200-25-51.

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*Горнак И.А.* Военная администрация. У практыкум увайшлі больш за 450 практыкаванняў і задач па асноўных тэмах курса.

**Гісторыя замежнай літаратуры.** Выкладаецца навучальная праграма па курсе.

*Антоненко А.Н., Дунай В.И.* **Центральная нервная система человека.** Дапаможнік дае звесткі пра развіццё, будову, тапаграфію і функцыі аддзелаў цэнтральнай нервовай сістэмы чалавека.

*Калацкая Л.В., Новиков В.А., Галушко Е.В.* **Информатика.** Практыкум змяшчае звесткі для рашэння прыкладных задач па інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогіях.

**Украінская літаратура. У 5 частках. Частка 2.** У хрэстаматыі знайшлі




адлюстраванне ўсе значныя з'явы ўкраінскай літаратуры XIX ст., таксама даецца характарыстыка літаратурнага працэсу.

*Альсевич В.В., Крахотко В.В.* **Методы оптимизации: упражнения и задания.** Вучэбны дапаможнік дае ўвесь аб'ём тэарэтычнага матэрыялу, які ўваходзіць у курс па метадах аптымізацыі ў канечнамерных і функцыянальных прасторах, прыводзіцца падрабязнае рашэнне тыпавых задач, а таксама дастаткова вялікі набор варыянтаў заданняў для правядзення практычных заняткаў і самастойнага вывучэння кожнай тэмы.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

НАШЫ ГОСЦІ

# ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ СТУДГАРАДКА

**Літаратурна-музычная гасцёўня "Натхненне" існуе ў студгарадку БДУ ўжо пяць гадоў. Утульны пакой на пятым паверсе інтэрната № 7 тры разы на тыдзень збірае аматараў прыгожага. Паэтаў, бардаў, выканаўцаў-дэкламатараў, спевакоў, музыкаў і іншых творчых асоб з ліку жыхароў інтэрната сустракае Галіна Махаева — стваральніца і ветлівая гаспадыня гасцёўні. Тут праводзяцца індывідуальныя і групавыя заняткі, а таксама ладзяцца тэматычныя вечарыны, сустрэчы з вядомымі дзеячамі беларускай культуры. За мінулыя гады са студэнтамі дзяліліся натхненнем рэжысёры тэатра і кіно (Б. Луцэнка, М. Ізворска-Елізар'ева, Н. Башава, І. Дабралюбаў), паэты (Л. Дранько-Майсюк, А. Лягчылаў, М. Аўрамчык, А. Чорная, А. Аўруцін), музыказнаўцы (А. Агаркава, О. Брылон), мастакі (Н. Шчасная). Прапануем вам пазнаёміцца з творчасцю "гасцёўцаў".**



Ігар КАНАНОВІЧ,
філфак, IV курс

***

Творчасць добрага майстра
насамрэч джыхад,
Дзе бясконцая меншасць
і хцівая маса.
Творчасць добрага майстра —
бязлітасны хадж
Да святынь прыгажосці.
Сцяжына — не траса.

Белым сонцам пустэльні
апалены твар.
На знямоглым вярблюдзе —
малітвы Алаху.
У аазісах здрада:
з калодзежаў жар
Патыхае — у ноздры
пылінкамі жаху.

Сам сабе праваднік
у зыбучых пясках.
Мёртвы горад людзей
не падзеліцца ценем.
Чым далей, тым цяжэй
налягае рука
На здарожаны посах
высокіх памкненняў.

І нарэшце прыпынак.
Відзежаў кашмар.
Аціхае агонія. Лік Джабраіла.
Пір чакае цябе.
І з апошнім "Акбар!"
Распраўляе душа
снежна-белыя крылы.

Ірына ЗМАЧЫНСКАЯ,
філфак, II курс

***

Звон. Звон. Звон.
Гул. Боль. Стогн.
Цень. Пагроза. Хмара.
Захопнікі. Навала.
Гадзіннік. Вакзал. Цягнікі.
Хлапцы. Маладыя. Байцы.
Разлука. Паштоўкі. Лісты.
Бомбы. Кулі. Гарады.
Атакі. Баі. Блакады.
Рыдлёўка. Сухар. Патрон.
Лагер. Каты. Палон.
Дрот. Голад. Крок — курок.
Куля.
Не мінула.

Сонца. Спеў. Нябёсы.
Дождж. Світанак. Росы.
Лес. Жыта. Васількі.
Дзіцячыя галаскі.

Балючыя ўспаміны.
Зямля. Попел. Магілы.
Руіны. Руіны. Руіны.

Я не хачу вайны!
Зямля мая —
Спас
На крыві.

Звон. Звон. Звон.
Гул. Боль. Стогн.

Марыя СТАНОЎКА,
філфак, выпускніца 2005 г.

***

Вецер заціх.
Гэта мы паскладалі крылы.
Кропля сутоння
У келіху поўнай цемры.
Час падыходзіць
Пустэчай пад бераг Леты.
Вочы заплюшчы.
Нас зноў засыпаюць жвірам.

Добрага ранку
Усім, хто ідзе па сонца.
Ліха зламае зубы аб нашы песні.
Попелам долу абсыплецца
Злая зорка.
Нас — напалову.
Астатняе — рэшткі міфаў.

Новы Ікар паспрабуе
падсмажыць пяткі.
Шлях Адысея патоне
ў бутэльцы спірту...
Нам — усё роўна.
Не варта узмаху крылаў.
Зараз мы сталі
Адзіным
Дыханнем
Свету...

Юлія СЁМКА, філфак, II курс

***

Так хутка час зямны бяжыць,
Але наперакор таму здаецца,
Што засталося яшчэ
шмат пражыць,
Жыццё ж імклівай птушкай
пранясецца...

Так ці інакш, усё ж
павінен кожны
Аддаць падзяку і Хрысту, і лёсу
За радасць сустракаць
дзень Божы,
Яго праводзіць зоркамі
ў нябёсах.

Падумаць: след які пакінеш,
чалавек, —
Надзеі, веры ці трывогі?
І што паспееш за кароткі век
Зрабіць, мінаючы
жыццёвую дарогу?

Каб у вачах наступных
пакаленняў
Нам промнем сонечным
адвеку заблішчаць
І з плачу, з енкаў усіх маленняў
У нябёсы гонар свой узняць!

Ці не у гэтым ўжо каторы век
Ёсць сэнс жыцця зямнога,
чалавек?

# А МУЗЫКА ГУЧАЛА...

Традыцыйны конкурс студэнцкай песні "Срэбраныя струны" прайшоў 14 снежня ў актавай зале гістарычнага факультэта. На гэты раз ён сабраў 18 аматараў гітарнай музыкі. Ён выклікаў вялікую цікавасць: гледачы амаль цалкам запоўнілі залу.

Конкурсная частка была вельмі разнастайнай. Канкурсанты спявалі не толькі чужыя, але і свае ўласныя песні. Рэпертуар прадэманстраваў, што студэнцкая песня не мае аніякіх межаў ні ў мовах (спявалі па-руску, па-беларуску, па-англійску), ні ў стылях (выконвалі не толькі бардаўскія і папулярныя кампазіцыі, але нават і рэп).

Гледачы шчыра віталі ўсіх выканаўцаў, але ўсё ж такі былі вызначаны лепшыя з іх. Іван Транчонак з песняй "Без назвы" заняў першае месца ў намінацыі "Аўтар", а Дзяніс Лугін з песняй "Дзе мой край" перамог у намінацыі "Выканаўца". Гран-пры фестывалю атрымалі Антаніна Станкевіч і Аляксандр Юрчанка з песняй "Dreams".

Апякунскі савет студэнцкага гарадка падарыў кожнаму з удзельнікаў памятныя прызы, а таксама магчымасць запісацца на студыі эстраднай песні БДУ пад кіраўніцтвам Леаніда Шырына.

**Уладзімір БАСЬКО,**
**студэнт V курса**
**юрыдычнага факультэта**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# "ЗОРНЫЯ" ЮРЫСТЫ

***На юрыдычным факультэце 28 лістапада адбыўся конкурс маладых талентаў "Фабрыка зорак — 4".***



Гэтае мерапрыемства ўжо чацвёрты год запар дае магчымасць першакурснікам паказаць сябе, выявіць свае творчыя здольнасці. "Юрфак — гонар, прэстыж, поспех" — менавіта такі дэвіз конкурсу. Сёлета прадстаўнікі пяці груп зрабілі з "Фабрыкі" сапраўднае шоу — цікавае, вясёлае, змястоўнае і яскравае.

Сярод індывідуальных удзельнікаў найбольш запамінальнымі сталі выступы Вадзіма Хейфіца (1-я група) з яго варыяцыямі на тэму "Yesterday", а таксама дзвюх маладых спявачак — Насці Несцярковай (9-я група) і Ганны Сянкевіч (5-я група).

Студэнцкія калектывы ператварылі свае праграмы ў маленькія канцэрты, складзеныя з некалькіх нумароў. Трынаццатая група ўразіла вершамі юных паэтак і песнямі аб роднай зямлі, за што і атрымала тытул "Самая лірычная група". Студэнты з чатырнаццатай групы не адсталі ад сваіх сапернікаў: яны выканалі ўласныя песні, пераклалі фразу "Палітолагі ўсіх кран, яднайцеся" на шматлікія мовы, прадэманстравалі валоданне прыёмамі каратэ і атрымалі прызнанне як "Самая дружная і з'яднаная група".

Па-за конкурснай праграмай выступіла госця з філфака Вольга Шашута, а таксама ўлюбёнцы публікі — гурты "Моцарт" і "Монблан", праект Comedy Club (юрфак-стайл).

Асаблівасць гэтага конкурсу ў тым, што ніхто з удзельнікаў не застаецца без увагі: усе атрымалі падарункі. Арганізатарамі яго сталі Саюз жанчын БДУ і дэканат юрыдычнага факультэта.

**Настасся ЮДЧЫЦ**

КОНКУРС!

# ЛІТАРАТУРНЫ ПРАМЕНАД

Рэдакцыя газеты "Універсітэт" на сваім сайце www.gazeta.bsu.by аб'яўляе ў 2007 годзе конкурс сярод студэнтаў і выкладчыкаў БДУ на лепшы літаратурны твор і фатаграфію па 5 намінацыях:

- вершы;
- кароткае апавяданне ці эсэ;
- артыкул пра адметных выкладчыкаў альбо цікавых аднакурснікаў;
- вясёлая гісторыя пра студэнцкае жыццё ў alma-mater (вучоба, вольны час, пражыванне ў інтэрнаце і інш.) ці анекдот;
- гумарыстычны фотаздымак з жыцця (вучобы) у БДУ.

Прадугледжана магчымасць каментарыяў і інтэрактыўнага галасавання. Найлепшыя работы будуць вызначацца па некалькіх крытэрыях: сярэдні рэйтынг, характар водгукаў, агульная колькасць наведванняў. Напрыканцы іх будзе разглядаць аўтарытэтная экспертная камісія. Самыя ўдалыя творчыя знаходкі будуць друкавацца на старонках газеты. Аўтары-пераможцы атрымаюць падарункі і прызы ад рэдакцыі. З імі будзе арганізавана інтэрв'ю.

На конкурс прымаюцца беларускамоўныя творы, рускамоўныя — па-за конкурсам,

Памер матэрыялаў — для вершаў і эсэ не больш за дзве друкаваныя старонкі, для артыкула і вясёлай гісторыі не больш за адну друкаваную старонку (для ўсіх — фармат А4, 14 кеглем).

Пажаданы таксама і фотаздымак аўтара.

**Наш адрас: вул. Бабруйская, 7, каб. 411. Электронная пошта: gazeta@bsu.by.**

## З УСМЕШКАЙ

Канец снежня. Лекцыі ў інстытуце. Выкладчык: "Мы не паспелі разабраць важную тэму. Таму правядзем дадатковыя заняткі". Адкрывае штодзённік і пачынае ўзірацца ў запісы: "Та-а-ак... Вось у мяне вольны вечар 30 снежня і раніца 31-га. Які дзень выбіраеце?" Амаль усе студэнты хорам: "А давайце правядзем 31-га ўвечары!!!" Выкладчык абсалютна сур'ёзна: "Адну хвіліначку... Зараз гляну, што ў мяне запланавана на 31 снежня..."

***

Адзін студэнт другому:

— Ведаеш, наш выкладчык размаўляе сам з сабой.

— Наш таксама. Але ён гэтага не ўсведамляе. Ён думае, што мы яго слухаем.

***

Дацэнт:

— Вы зноў не падрыхтаваліся? Вы ж абяцалі стаць у гэтым семестры іншым чалавекам!

Студэнт:

— Я і стаў іншым чалавекам, але ён таксама выявіўся лайдаком.

***

Хлопец па блаце паступае ў інстытут. Экзаменатар:

— А зараз пытанне "на засыпку": паміж кім і кім была руска-японская вайна?

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты — Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

27 снежня 2006 года
Падпісана да друку 26.12.2006 г.
Зак. 1209. Тыраж 1000 экз.Ум. друк. арк 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7,
пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by